# Новае працоўнае папаўненне

Небывалы працоўны рытм адчуваецца сёння на вялікай будоўлі. Больш стала людзей, прыбавілася механізмаў. «Старажылы» цёпла сустракаюць «навічкоў». Але адны і другія гараць жаданнем як можна хутчэй узвесці гігант беларускай хіміі ў дзеянне. Трэба, каб у пачатку 1964 года першая чарга калійнага камбіната ўступіла ў строй, каб няспынным патокам пайшла на палеткі ўзбагачальная калійная соль.

Дапамогу салігорцам аказваюць будаўнічыя арганізацыі сталіцы нашай рэспублікі. Напрыклад, Мінскі трэст № 3 накіраваў на будаўніцтва калійнага камбіната 96 лепшых рабочых розных спецыяльнасцей. Сярод прыехаўшых — цэлыя брыгады. Так, актыўна ўключыліся ў работу муляры, брыгада, якой кіруе Мікалай Барцук, цесляры Івана Шчацінскага і іншыя.

Будаўнічыя трэсты № 1 і 4 паслалі ў Салігорск 158 чалавек. Машыністы Тасюкоў і Шумскі прыехалі разам са сваім аўтакранам.

Толькі на 25 верасня ў Салігорск прыехала больш 40 інжынерна-тэхнічных работнікаў і звыш 760 рабочых розных спецыяльнасцей.

Новае працоўнае папаўненне ўлілося ў працавітую сям'ю салігорцаў.

А. СЦЯПАНАЎ.

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ